УДК 94(476)+378.147

# ФАРМІРАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ТЭХНІЧНЫХ УСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАГА АСЯРОДДЗЯ БЕЛАРУСІ

**І. А. Пушкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій,
г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь

З атрыманнем незалежнасці ў грамадскай, асобаснай, а таксама навуковай свядомасці постсавецкіх супольнасцяў сфарміраваўся новы падыход да разумення задач нацыянальнага і эканамічнага развіцця. Яго складовай і неабходнай часткай з'яўляецца адначасовае фарміраванне патрыятызму і прафесійных, асабліва прадпрымальніцкіх, кампетэнцый у выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Менавіта гэтаму спрыяюць вучэбныя дысцыпліны гуманітарнага профілю, якія выкладаюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце харчовых і хімічных тэхналогій: "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Сацыялогія кіравання", "Эканоміка", "Прававое забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці", "Этыка і псіхалогія дзелавых адносін", "Прававое рэгуляванне гаспадарчай дзейнасці", "Карупцыя і яе грамадская небяспека", "Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю", "Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва", "Прававое забеспячэнне бізнеса", "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа".

Для далучэння навучэнцаў да пошуку і кіравання ведамі, набыцця вопыту самастойнага рашэння розных задач, забеспячэння выхаваўчай функцыі адукацыйнага працэсу выкладчыкамі кафедры гуманітарных дысцыплін выкарыстоўваюцца сучасныя тэхнічныя сродкі навучання, тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, вучэбна-даследчай дзейнасці, праектныя (складанне бізнес-планаў), камунікатыўныя (дыскусія, вучэбныя дэбаты, прэс-канферэнцыі), гульнявыя (удзел у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях) тэхналогіі, аналіз сітуацыі і інш. Рэалізоўваюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі: вучэбна-метадычныя комплексы (у тым ліку электронныя); варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, метад кейсаў, методыкі актыўнага навучання. Для арганізацыі кантрольнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя (прамежнае тэсціраванне, як распрацаванае выкладчыкам так і выдадзенае іншымі), крэдытна-модульныя сістэмы адзнакі вучэбнай, даследчай, кіруемай самастойнай работы навучэнцаў.

Пераважная большасць дысцыплін гуманітарнага профілю цалкам забяспечаны вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, распрацаваны і ўкаранёны ў навучальны працэс курсы лекцый у фармаце прэзентацый і электронныя вучэбна-метадычныя комплексы (атрыманы рэгістрацыйныя пасведчанні Дзяржаўнага рэгістра інфармацыйных рэсурсаў). На працягу вывучэння дысцыплін прадугледжваюцца лекцыйныя, практычныя заняткі, правядзенне экскурсій на прадпрыемствы, па Магілёву і музеям горада, напісанне рэфератаў (вучэбна-даследчых прац), прамежнае тэсціраванне. На практычных занятках і падчас кіруемай самастойнай працы студэнты ствараюць бізнес-планы, інавацыйныя прапановы для прадпрыемстваў харчовай прамысловасці.

Мною назапашаны пэўны вопыт адначасовага фарміравання патрыятызму і прадпрымальніцкіх кампетэнцый пры выкладанні дысцыплін: "Гісторыя", з гэтага навучальнага года – "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Прававое забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці", "Прававое рэгуляванне гаспадарчай дзейнасці", "Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю", "Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва", "Прававое забеспячэнне бізнеса", "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа".

Патрыятызм – гэта палітычны прынцып і сацыяльнае пачуццё, свядомая любоў да свайго народа, яго традыцый, прыхільнасць да радзімы, адданасць ёй і гатоўнасць да ахвяр дзеля яе. Прадугледжвае гонар за дасягненні і культуру сваёй радзімы, жаданне захоўваць яе

характар і культурныя асаблівасці і ідэнтыфікацыю сябе (асаблівае эмацыйнае перажыванне сваёй прыналежнасці да краіны і свайго грамадзянства, мовы, традыцый) з іншымі прадстаўнікамі свайго народа, імкненне абараняць інтарэсы радзімы і народа. Прадпрымальніцкія кампетэнцыі – асабістыя або дзелавыя якасці, навыкі, мадэлі паводзін, валоданне якімі дапамагае пасяхова вырашаць пэўную бізнес-задачу і дабівацца высокіх вынікаў. Чым большая колькасць прадпрымальніцкіх кампетэнцый ёсць у арсенале чалавека, тым з большай верагоднасцю ён справіцца з бізнес-задачамі, якія стаяць перад ім.

Пры вывучэнні “Гісторыі”, “Гісторыі беларускай дзяржаўнасці”, “Гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілёва”, “Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа” аналізуюцца працэсы дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык, разгортвання падзей Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, іх узаемаабумоўленасці і ўздзеяння на лёсы народаў СССР, Еўропы, усяго свету, уклад беларускага народа ў разгром агрэсараў, захаванне сваёй свабоды і нацыянальнай ідэнтычнасці, вытокі патрыятызму і крыніцы Вялікай Перамогі.

Найперш навучэнцы знаёмяцца з дзейнасцю знакамітых асоб, звязаных з гісторыяй і культурай Беларусі, асноўнымі помнікамі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны; вучацца характарызаваць і аналізаваць сацыяльна-эканамічную гісторыю, а таксама культуру, паводзіны, свядомасць, менталітэт насельніцтва розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў у кантэксце іх інтарэсаў, плюралізму поглядаў і аб’яднаўчага мясцовага патрыятызму.

Дысцыпліны “Прававое забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці”, “Прававое рэгуляванне гаспадарчай дзейнасці”, “Прававое забеспячэнне бізнеса” прадугледжваюць авалоданне навучэнцамі навыкамі работы з дзеючымі нарматыўна-прававымі актамі, уменне пошуку прававой інфармацыі, выкарыстанне яе ў практычнай рабоце камерцыйных і некамерцыйных арганізацый на ўсіх стадыях стварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі юрыдычных асоб. Развіццё прававой культуры і пачуцці адказнасці ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны адбываецца на практычных занятках пры вырашэнні праблемных сітуацый і задач у гаспадарчай дзейнасці, пры выкананні творчых заданняў і напісанні рэфератаў. Дарэчы, у якасці экспертаў выступаюць навучэнцы супольна з выкладчыкам.

На занятках па “Асновах кіравання інтэлектуальнай уласнасцю” навучэнцы вучацца распрацоўваць вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, таварныя знакі, фірменныя найменні, геаграфічныя ўказанні, заключаць аўтарскія, выдавецкія і ліцэнзійныя дагаворы ў сувязі з выбранай імі спецыялізацыяй. Тэматыкай іх прапаноў выступае культурна-гістарычная спадчына беларускага народа.

Пры гэтым асноўны акцэнт зроблены на Беларускае Падняпроўе, якое з’яўляецца самым цікавым рэгіёнам Усходняй Еўропы. Невыпадкова менавіта тут былі выяўлены самыя старажытныя ў Беларусі стаянкі першабытных людзей. На працягу стагоддзяў Магілёўшчына і горад Магілёў знаходзіліся на месцы сутыкнення чалавечых інтарэсаў і канфліктаў: рэлігійных, міждзяржаўных, нацыянальных. Але магілёўцы імкнуліся пакінуць пасля сябе дабро, веліч, высакародныя ўчынкі, прыгажосць, памкненні, увасобленыя ў помніках матэрыяльнай і духоўнай культуры. Магілёў зведаў багацце і веліч, войны і разбурэнні, уздым і заняпад. Нягледзячы ні на што, захаваў у гістарычнай і культурнай спадчыне магілёўцаў своеасаблівасць і адметнасць, якія вартыя памяці і ўшанавання.

Любыя веды аб мінулым Магілёўскага краю, сваёй “малой Радзіме”, набліжаюць іх да нас, узбагачаюць нашыя пачуцці, запаўняюць навакольную прастору і папярэдні нам час мноствам падзей і асоб. Гісторыя і культурныя здабыткі дазваляюць убачыць у далёкай даўніне тое, што было для яе будучыняй, прынамсі гэта дазваляе вучыцца ў яе. Выказваючы свой гонар за мінулае, мы спадзяемся, што наступныя пакаленні будуць ганарыцца днём сёняшнім, учынкамі і справамі людзей першай паловы XXI стагоддзя.

З вялікай колькасці падзей і асобаў, мною выбраны найбольш цікавыя, якія можна выкарыстаць сучаснікамі ў сваёй практычнай дзейнасці. Падчас складання навучэнцамі

бізнес-планаў або інавацыйных праектаў, гістарычная і культурная спадчына Беларусі, Магілёва і магілёўцаў знаходзіць сваё прымяненне ў сферы вытворчасці і рэалізацыі прадуктаў харчавання, турызме, рэкламе, стварэнні архітэктурных і геаграфічна-ландшафтных асяродкаў, у назвах харчовых брэндаў, прадпрыемстваў, фірм, крам, кавярняў, рэстаранаў, тавараў, блюд і г.д. Навучэнцы, працуючы над стварэннем прадукта харчавання, прадпрыемства па яго вытворчасці або рэалізацыі, аб'екта грамадскага харчавання, распрацоўваюць: назву, выгляд, таварны знак, брэнд, афармленне (упакоўка, вітрына, стэнд і г.д.), каляровую гаму, рэкламу. Абавязкова абгрунтоўваюцца інавацыйнасць праекта, выдаткі і прыбыткі, пралічваюцца – сфера выкарыстання і рэалізацыі, катэгорыя спажыўцоў, шляхі пасоўвання на рынак, звязаныя з аб'ектам бізнэс-плана тавары, магчымасць узнікнення новых відаў ці шляхі пашырэння справы. Усё гэта скіравана на эфектыўнасць працы, таму прысутнічае эканамічнае, гістарычнае і патрыятычна-выхаваўчае абгрунтаванне, сувязь з прадметам дысцыпліны і спецыялізацыяй студэнтаў.

Для прыкладу, у 2020 г. бізнес-праекты і кіруемая самастойная праца былі ў асноўным прысвечаны 75-годдзю Перамогі, а ў 2021 г. 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны і 30-годдзю Незалежнасці Рэспублікі Беларусь: спосабам (формам, метадам) ушанавання памяці падзей і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай (Другой сусветнай) вайны, вольнаму часу і ўмовам побыту ўдзельнікаў баёў, жыццю насельніцтва на акупаванай тэрыторыі і падчас аднаўлення краіны, гераічнай працы ў тыле і інш.; падзеям, якія папярэднічалі і сведчылі аб першых гадах існавання Рэспублікі Беларусь, знешнепалітычных абставінах, умовах жыцця насельніцтва, дзейнасці асоб паўплываўшых на развіццё працэсу нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і г. д.

Такім чынам, выкладанне ведаў аб дзейнасці юрыдычных асоб, аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці і іх выкарыстанні, нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве Беларусі, гістарычнай і культурнай спадчыны роднага краю актуалізуе ў навучэнцаў і выпускнікоў павагу да гістарычнага мінулага свайго народа, гонар за яго дасягненні, актывізуе дзейнасць па стварэнню новага і прагрэсіўнага, садзейнічае фарміраванню патрыятызму і прафесійных (прадпрымальніцкіх) кампетэнцый, практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач, функцый выпускнікоў тэхнічных устаноў вышэйшай адукацыі.

Спіс літаратуры

1 Агеев, А. Г. Перекрёстки Могилёвской истории / А. Г. Агеев, Я. И. Климуть, И. А. Пушкин. – Минск: ООО"Туринфо", 2004. – 216 с.

2 Агееў, А. Р. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917–1918): манаграфія / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 292 с.

3 Дыжова, А. А. Методы и средства исследований: Конспект лекций / А. А. Дыжова. – Могилев: УО МГУП, 2009. – 128 с.

4 Курков, И. Могилёвщина: легенды, события, люди / И. Курков, И. Пушкин. – Минск: Медиафакт, 2008. – 368 с.

5 Пушкин, И. А. Исторический очерк создания и деятельности Могилёвского государственного университета продовольствия / И. А. Пушкин // 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия / редкол.; В. А. Шаршунов (пред.). – Минск: Изд. центр БГУ, 2009. – С. 2–53.

6 Пушкін, І. А. Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва: Курс лекцый / І. А. Пушкін. – Магілёў: УА МДУХ, 2006. – 150 с.

7 Пушкін, І. А. Грамадзянская супольнасць і дзяржава. Станаўленне беларускага самакіравання / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў: МДУХ, 2017. – 182 с.

8 Пушкін, І. А. Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2018. – 423 с.